Аляксей Камінскі

загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры
і мастацтваў», дацэнт (г. Мінск, Беларусь)

# Феномен абраднасці. Сімволіка-камунікатыўныя формы

Асновай любой этнічнай культуры з'яўляецца генетычная памяць нацыі — сувязь пакаленняў у часавым і прасторавым вектарах. Менавіта гэта звышнатуральная энергія ў час раптоўных сацыякультурных пераломаў прымушае чалавека звярнуцца да стабільнай першаасновы, мінулага, як да сродка натуральнага самазахавання.

На сучасным этапе народныя традыцыі ўсё менш займаюць дамінуючыя пазіцыі ў сямейным і грамадскім жыцці насельніцтва. З'яўленне і папулярызацыя разнажанравай масавай культурнай прадукцыі істотна паўплывала на трансфармацыю аўтэнтычнага фальклору, этнаграфічнай і мастацкай спадчыны краіны. У святочнай практыцы адбываецца працэс рэанімацыі, рэстаўрацыі і трансфармацыі рэшткаў культурнай спадчыны розных гістарычных напластаванняў, якія здольныя інтэграваць паміж сабой, пераўтвараючыся ў навацыйныя элементы культурнага фонду нацыі. Але адпаведна тэорыі вечнага руху прыроды і грамадства любая навацыя з цягам часу абавязкова мадыфікуецца ў традыцыю [1, *97—99*].

У дахрысціянскім грамадстве найбольш важнымі сімвалічнымі формамі, здольнымі замацаваць у калектыўнай свядомасці традыцыйныя і навацыйныя схемы сацыякультурнага быцця, з'яўляліся міфы, абрады, рытуалы, сістэма табу і татэмічных культаў. У архаічным абшчына-вясковым соцыуме традыцыя існавала як працяглая ўстойліва-нязменная і недатыкальная форма быцця, своеасаблівая сістэма каштоўнасцей з міфічнай першаасновай.

На стадыі ўзнікнення і першапачатковага існавання народная святочная традыцыя заўсёды прасякнута сакральнасцю і непарушальнасцю, дзейнічае пастулат яе вечнасці, неўміручасці. Але непрыкметна для чалавека яна пастаянна ўдакладняецца і з цягам часу пераўтвараецца ў эпізадычны сегмент трансфармаванага свята. Пры змене традыцыі інварыянтам становіцца і абрад — усталяваная сістэма сімвалічных дзеянняў, якія афармляюць важныя падзеі грамадскага і асабістага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыцця чалавека. Абрады па сваёй форме з'яўляюцца вобразнымі мастацкімі дзеяннямі, якія аказвалі эстэтычнае ўздзеянне на чалавека. Некаторыя з іх з цягам часу становяцца народнай гульнёй, забавай, варажбой, арганічна ўваходзяць у структуру новага святочнага формаўтварэння. Са сферы магічнай абрады пераходзяць у сферу тэатральна-гульнявую, увасабляючыся ў сцэнічныя прадстаўленні. «Значная частка абрадаў з'яўляецца ў асобных сваіх фрагментах як міфалогія — па зместу, як гульня — па форме» [2, *48*].

Першапачаткова абрад забяспечваў бесперапынную перадачу ведаў, каштоўнасцей, інфармацыі для пасвячэння чалавека ў тайны прыроды, працэсу пераадолення чалавекам умоўнай мяжы ў часава-прасторавым вектары як «мінулае — сучаснае — будучае» і сацыяльна-асобасным, звязаным з пераходам у новую якасць. Змест «абрадавага тэксту» перадаваўся пры дапамозе сімвалаў, якія ўмоўна выконвалі функцыю прыродных стыхій, ўзбуджалі эмоцыі і пачуцці ў індывіда або групы мовай рытуальнага рэквізіту, вербальных формул, танцавальных рытмаў, мастацка-вобразных схем [6, *176*]. Выканаўцы абраду знаходзіліся ў вызначанай рытмічнай структуры, ажыццяўлялі пэўную паслядоўнасць элементаў: выкарыстоўвалі маскі, накладалі грым, апраналіся ў касцюмы хатніх і дзікіх жывёл, уваходзілі ў транс і прайгравалі пэўную сітуацыю ў прасторава-часавым кантынууме, набываючы новыя асобасныя якасці. Імітуючы розныя прыродныя стыхіі, паводзіны жывёл у «тэатральнай форме», продкі імкнуліся дасягнуць адзінства з багамі і міфічнымі героямі, упрасіць аб дапамозе, «навязаць» ім карыснае для чалавека рашэнне і далучыцца да іх магутнай сілы, каб уладарыць сусветам.



У абрадах жыццёвага цыкла, якія суправаджалі асноўныя этапы жыцця чалавека, «адлюстраваліся і замацаваліся архаічныя вераванні і рытуалы, сканцэнтраваныя вакол універсальнага сусветнага ўяўлення — праз смерць да новага нараджэння» [3, *66*]. Сямейныя абрады — абрады пераходу, змянення асноўнага статусу чалавека. Яны выконваліся ў асноўныя, пераломныя моманты жыцця. Галоўным, што прысутнічае ва ўсіх пераходных комплексах, з'яўляецца наяўнасць лімінальнай істоты. Пры гэтым у абрадах у большасці ўдзельнічаюць іншыя сваякі (сям'я, род), магічныя і немагічныя спецыялісты, святары, а ў некаторых выпадках і вясковая абшчына. Да катэгорыі рэлігійных абрадаў належаць калектыўныя дзеянні, якія скіраваны на звышнатуральныя ілюзорныя аб'екты і выступаюць як спосаб рэалізацыі адносін паміж гэтымі аб'ектамі і чалавекам, уключаючы яго ў сферу духоўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалій, кантынуум вечных пазачасава-пafторавых боскіх энергій. «Кожная рэлігія мае сваю сістэму і рэгламентацыю абрадавых дзей. Іх разнастайнасць абумоўлена асаблівасцямі веравучэння, нацыянальна-этнічнымі традыцыямі і ўмовамі жыцця веруючых людзей» [7, *7*]. Сакральныя боскія рэаліі могуць быць зразумелымі толькі ў той ступені, у якой успрымае іх чалавек. Правядзенне аказіянальных абрадаў адбываецца пры крытычным становішчы ў грамадстве (крызісныя) ці для магічнага выклікання падобнага крызісу (выкліканне дажджу пры засушлівым надвор'і), пераадольванне прыроднага, грамадскага ці асобнага крызісу (антыкрызісныя). У старажытнасці магічныя дзеянні праводзіліся асобнымі членамі групы (шаманамі, валхвамі, чараўнікамі), якія штучна даводзілі сябе да экстатычнага стану і размаўлялі з духамі, прадказвалі будучыню, вылечвалі ад хвароб, выклікалі змены ў прыродзе і выпраўлялі памерлых у падземны свет. Да ліку грамадзянскіх абрадаў адносяцца вытворчыя, сямейныя, дзяржаўныя, палітычныя, прафесійныя. У залежнасці ад складу выканаўцаў грамадзянскія абрады падзяляюцца на асабовыя, групавыя, абшчынныя. Па гендэрнай і ўзроставай прыкметах вылучаюцца дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя, дзявочыя, жаночыя, мужчынскія, старэчыя абрады.

Для позніх абрадаў характэрна развіццё сімвалічных і гульнёвых элементаў, знікненне або трансфармацыя магічных, генетычна злучаных з прымітыўнай аграрнай, жывёлагадоўчай, прамысловай тэхнікай і з устойлівасцю абшчынных, родавых і сямейных адносін.

Найбольш выразным канструктам абрадава-рытуальных урачыстасцей з'яўляецца сімвал — ёмістая і выразная форма сэнсу, вызначаная, устойліва сацыяльна-зафіксаваная рэч, змест і прызначэнне якой перадаюцца ад пакалення да пакалення. Абрад і знак — асноўныя элементы любой ініцыяцыі, якія выступаюць разам у рэаліях традыцыйнага характару. Стрыжнем усёй абрадава-святочнай сімволікі традыцыйнай культуры з'яўляюцца каляндарныя атрыбуты. Адны і тыя ж знакі, якія трактуюцца па-новаму ў розных сітуацыях, могуць ужывацца адначасова ў каляндарных і сямейных святах, вытворчых, любоўных, лячэбна-прафілактычных рытуалах. «Такая ўніверсальнасць традыцыйнай сімволікі сведчыць пра наяўнасць агульных прыёмаў і прынцыпаў рытуалізацыі ў народнай культуры. Яна таксама з'яўляецца водгукам старажытнасці, калі ўсе віды абраднасці існавалі нераздзеленымі ў рамках адзінага сінкрэтычнага арганізма» [5, *168*].

Аналіз гістарычных трансфармацый традыцый творчай арганізацыі абрадаў паказвае наяўнасць высокай мастацкай дасканаласці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і даставернасці прадметна-рэчавых сімвалаў, якія не толькі ўпрыгожваюць абрад, але і дапамагаюць увайсці ўдзельнікам у псіхалагічны стан дзеяння. Прызначэнне абрадавай сімволікі — выклікаць у свядомасці людзей пэўныя асацыяцыі з устойлівымі, звыклымі вобразамі.

Абрадавы рэквізіт традыцыйных каляндарных свят адрозніваўся значнай прастатой і лапідарнасцю. Яго галоўнай крыніцай і матэрыяльнай асновай з'яўляліся матэрыялы навакольнага асяроддзя і гаспадаркі селяніна. У больш позні час для вырабу сакральнай сімволікі дабавіліся набытыя ў крамах штучныя тавары — папера, залатая і срэбная фальга, завадскія фарбы. Удзельнікі, абрадавы рэквізіт прымаюць на сябе ролю знака мастацтва, набываюць рысы, уласцівасці і асаблівасці, якімі ў рэальным жыцці не валодаюць. Вызваляючыся ад прыналежнасці да бытавой рэчаіснасці, абрадавы кантынуум ператвараецца ў месца сімвалічнага дзейства. Тут сістэма знакаў утрымлівае ў сабе не толькі закадзіраваную інфармацыю, але і ўласцівасць камунікацыі.

Праз сістэму сімвалаў, знакаў і жэстаў, у якіх закадзіраваны паведамленні высокай ступені дакладнасці, абрадава-рытуальныя практыкі ўтвараюць каркас святочнага эксцэсу, афармляюць яго і з'яўляюцца сродкамі камунікацыі ўдзельнікаў у рытмічных з'явах жыцця, звязаных з прыроднымі цыкламі і часам чалавечай жыццядзейнасці.

Такім чынам, духоўнае і гістарычнае аб'яднанне людзей у межах сваёй культуры, перадача, захаванне этнічных паводзін, фарміраванне нацыянальных і мастацка-культурных асаблівасцей пэўнага калектыву дазволілі абрадам пражыць стагоддзі, стаць спосабам мыслення нашых продкаў і найважнейшым элементам народнага быцця. Іх першапачатковы варыянт зместу прадугледжваў рэгламентацыю паводзін індывідума ў маргінальнай прасторы і прыстасоўваў яго да існуючых сцэнарыяў соцыуму. У сімвалічна-вобразнай, мастацкай форме магічныя абрадавыя дзеі афармлялі асноўныя этапы жыцця чалавека. Абрад з'яўляўся актам камунікацыі, які ажыццяўляўся сродкамі асобай акцыянальнай мовы [6, *176*]. Невербальнымі кампанентамі ў большасці выпадкаў выступалі з'явы і працэсы высокай ступені дакладнасці, знакава-сімвалічны сэнс якіх быў зразумелым без моўных формул і пераведзены ў ідэйна-вобразную мову ўласнай этнакультуры. Да іх адносіліся акустычныя і тактыльныя сродкі зносін, адлегласць і ўзаемнае размяшчэнне ў прасторы суб'ектаў, склад цела, выраз твару, абмен прадметамі, рухі, жэсты, позы, маскі, адзенне і інш. [4, *188*].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Арутюнов, С. А.* Обычай, ритуал, традиция / С. А. Арутюнов // Сов. этнография. — 1981. — № 2.

2. *Ивлева, Л. М.* Дотеатрально-игровой язык русского фольклора / Л. М. Ивлева. — СПб. : Дмитрий Буланин, 1998. — 193 с.

3. *Казакова, І. В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. — Мінск : Універсітэцкае, 1995. — 150 с.

4. *Кочетков, В. В.* Психология межкультурных различий / В. В. Кочетков. — М., 2002. — 256 с.

5. *Курочкин, А. В.* Растительная символика календарной обрядности украинцев / А. В. Курочкин // Обряды и обрядовый фольклор. — М. : Наука, 1982. — 278 с.

6. *Михаил, З.* Этнолингвистические методы изучения народной духовной культуры / З. Михаил // Славянский и балканский фольклор. Реконструкция древнеславянской духовной культуры : источники и методы. — М. : Наука, 1982. — 272 с.

7. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2001. — 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ